# Каментар

## I. Ля вытокаў беларускага рэгіяналізму

* Манфрэд Крыдль (1882—1957) — гісторык і тэарэтык літаратуры. Доктарскую дысертацыю “Antagonizm wieszczów. Rzecz o stosunku Słowackiego do Mickiewicza” абараніў у Варшаве (1921). У 1932—1939 гг. — Прафесар універсітэта Стафана Баторыя ў Вільні.

* Станіслаў Станкевіч называе Польшчаю былую Рэч Паспалітую абодвух народаў.

* Літоўскі — у значэнні летувіскі, неславянскі.

* Тадэвуш Чацкі (1865—1813) — асветнік, палітычны дзеяч, сябра Адукацыйнай Камісіі, адзін з заснавальнікаў варшаўскага Таварыства сяброў навук.

* Гуга Калантай (1750—1812) — палітычны і рэлігійны дзеяч, публіцыст і літаратар.

* Таварыства сяброў навук — навуковае таварыства, якое гуртавала вучоных, літаратараў і аматараў навукі. Дзейнічала ў 1800—1832 гг. Сярод найбольш актыўных удзельнікаў — Станіслаў Сташыц, Юльян Урсын Нямцэвіч, Самуэль Ліндэ, Станіслаў Костка Патоцкі.

* Ксавэры Францішак Богуш (1746—1820) — грамадскі і рэлігійны дзеяч, пісьменнік, адзін з арганізатараў паўстання 1794 г. на Літве. Сябра Таварыства сяброў навук.

* “Tygodnik Wileński” — навукова–літаратурны штотыднёвік. У 1804 г. выходзіў пад рэдакцыяй В. Ізбіцкага і С. Стравінскага, сяброў віленскага Філаматычнага таварыства. Адноўлены ў 1815 г. Ёахімам Лялевелем (з 1818 г. выходзіў раз на два тыдні). Рэдактарамі выдання былі Міхал Балінскі, Ігнацы Шыдлоўскі і інш.

* Тэадор Нарбут (1784—1864) — гісторык, даследчык літоўскай мінуўшчыны, аўтар шматлікіх публікацый гістарычнага і археалагічнага характару.

* Эмерык Станевіч (1802—1872) — сябра таварыства філарэтаў, удзельнік паўстання 1830—1831 гг., эмігрант. Паходзіў са Жмудзі. Апублікаваў у 1819—1822 гг. 15 літоўскіх песень з перакладам на польскую мову.

* Антон Эдвард Адынец (1804—1885) — паэт, перакладчык, мемуарыст, сябра Таварыства філарэтаў.

* Ян Чачот (1796—1847) — паэт і фальклярыст, сябра Таварыства філаматаў.

* Леан Рагальскі (1806—1878) — літаратар і выдавец. Разам з Э. Станевічам збіраў літоўскія песні. Сябра Цэнтральнага віленскага камітэту ў 1831 г. (разам з А. Гарэцкім, М. Балінскім і інш.). Аднак давёў уладам сваю дабранадзейнасць, займаў важныя пасады ў расійскай адміністрацыі. З 1834 г. (тытулярны саветнік, жыў ва ўласным доме ў Вільні па вуліцы Нямецкай) выдаваў з І. Абрамовічам і І. Шыдлоўскім “Wierunki i roztrząsania naukowe”.

* “Nowy Pamiętnik Warszawski” (1801—1805) — грамадска–літаратурны і навуковы часопіс, шчыльна звязаны з Таварыствам сяброў навук. Рэдактарам быў Францішак Ксавэры Дмахоўскі.

* “Dziennik Wileński” — часопіс, які ў 1805—1806 гг. выдаваўся пад рэдакцыяй Анджэя Снядэцкага і Станіслава Юндзіла У 1815 г. Казімір Контрым аднавіў выданне. З 1818 г. да 1830 г. рэдактарам быў Антон Марціноўскі.

* Марыя Чарноўская — фальклярыстка і этнограф першай паловы XIX ст. Беларускія песні і абрады запісвала ў Крычаўскім павеце. Сваё даследаванне апублікавала ў “Dzienniku Wileńskim” (1817, т. 6). У перакладзе на расійскую мову артыкул друкаваўся

ў “Вестнике Европы” (1818, ч. 102) і “Северном архиве” (1822, ч. 4).

* Ігнат Шыдлоўскі (1793—1846) — рэдактар–выдавец, паэт і фалькларыст. Паводле іншых звестак, аўтар гэтага артыкула — З. Даленга–Хадакоўскі.

* Адам Міцкевіч (1798—1855) — геніяльны паэт, пачынальнік рамантызму ў польскай і беларускай літаратурах, адзін з заснавальнікаў таварыства філаматаў.

* Зарыян Даленга–Хадакоўскі (1784—1825) — славяназнавец, пачынальнік славянскай археалогіі, фалькларыстыкі і этнаграфіі.

* Францішак Равіта–Гаўронскі (1846—1930) — літаратар, гісторык, выдавец і рэдактар. Прыхільнік польска–ўкраінскага збліжэння, аўтар біяграфіі З. Даленгі–Хадакоўскага, шматлікіх гістарычных працаў (“Rok 1863 na Rusi”, 1902—1903).

* Канстанцін Калайдовіч (1792—1832) — археограф, гісторык і філолаг. У 1822 г. З. Даленга–Хадакоўскі даслаў графу М. Румянцаву вынікі сваіх даследаванняў. Ацэнку мусіў даць К. Калайдовіч, які з–за свае непрыхільнасці да З. Даленгі–Хадакоўскага выказаўся адмоўна.

* Пётр Бяссонаў (1828—1898) — філолаг–славіст і фалькларыст. Вызнаваў і развіваў у сваіх працах ідэі “западноруссизма”.

* Крыстын Лях Шырма (1790—1866) — пісьменнік і публіцыст. У 1811—1813 гг. вучыўся ў Віленскім універсітэце. З 1824 г. прафесар Варшаўскага універсітэта. Удзельнік паўстання 1830—1831 гг. Эміграваў у Англію, дзе падтрымліваў дачыненні з А. Рыпінскім і І. Яцкоўскім.

* Таварыства шубраўцаў — згуртаванне віленскіх асветнікаў, якое дзейнічала ў 1817—1822 гг. Сярод найбольш актыўных сяброў — Казімір Контрым (Паклюс), Якуб Шымкевіч (Пяркунас), Казімір Стравінскі (Бубліос), Адам Завадскі (Свейтэстікс), Антон Марціноўскі (Патэла), Ян Багуслаў Рыхтар (Сэймі), Міхал Балінскі (Аўшлявіс), Леан Бароўскі (Пергрубюс), Францішак Гжымала (Гурхо), Антоні Гарэцкі (Варпу), Анджэй Снядэцкі (Сатварас), Ігнацы Шыдлоўскі (Гульбі), Тадэвуш Булгарын (Дэрфінтас), Юзаф Сянькоўскі, Ян Ходзька (Вайзгантас), Ігнацы Ходзька (Віршайтас), Тамаш Зан (Ганігліс). Псеўданімы ўзяты з баламутнай міфалогіі Яна Ласіцкага “De Diis Samogitarum” (1615).

* “Wiadomości Brukowe” (1816—1822) — сатырычны штотыднёвік, орган Таварыства шубраўцаў. Выданне рэдагавалі К. Контрым і Я. Рыхтар. Вызначаўся асветніцкай скіраванасцю, высмейваннем невуцтва і сармацкіх традыцый шляхты.

* Якуб Шымкевіч (пам. 1818), славуты лекар, філантроп і дэмакрат; меў рэпутацыю дасціпніка і гумарыста. Адзін з арганізатараў Таварыства шубраўцаў.

* Анджэй Снядэцкі (1768—1838) — лекар, біёлаг, хімік і філосаф. Прафесар хіміі і медыцыны Віленскага універсітэту.

* Казімір Контрым (1776—1836), публіцыст, пісьменнік. Працаваў бібліятэкарам Віленскага універсітэту, быў адным з заснавальнікаў “Wiadomości Brukowych” і Таварыства шубраўцаў. Прымаў удзел у паўстанні 1830—1831 г. на Літве.

* Леон Бароўскі (1784—1846) філолаг, гісторык літаратуры, прафесар Віленскага універсітэту, сябра Таварыства шубраўцаў.

* Юзаф Трацяк (1841—1923) — гісторык літаратуры, прафесар Ягелонскага універсітэту.

* “Dzieje dobroczynności krajowej i zagranicznej z wiadomościami ku wydaskonaleniu jej służącymi” — часопіс, які выходзіў у Вільні ў 1820—1824 гг. Яго рэдактарамі і супрацоўнікамі былі: Казімір Контрым, Мікалай Маліноўскі, Леан Рагальскі, Антон Марціноўскі, Антон Эдвард Адынец. У выданні шмат месца займалі матэрыялы пра таварыствы дабрачыннасці ў былой Рэчы Паспалітай.

* Ян Ходзька (1776—1851) — пісьменнік і драматург, арганізатар масонскага руху на Беларусі, сябра Таварыства шубраўцаў, аўтар папулярнага твора для народа “Pan

Jan ze Świsłoczy, kramarz wędrujący” (1821), камедыі “Вызваленая Літва, або Пераход праз Нёман”.

* Антон Гарэцкі (1787—1861) — паэт, сатырык, удзельнік напаЛеанаўскіх войнаў і паўстання 1830—1831 гг.

* Тэадор Лазінскі (нар. 1794) — студэнт фізіка–матэматычнага факультэта, сябра таварыства філаматаў (прыняты разам з Я. Чачотам).

* Станіслаў Казакевіч (1802—1848) — сябра таварыства філаматаў, праўнік. Узначальваў Саюз Сяброў. У таварыстве філарэтаў кіраваў аддзелам права. Удзельнічаў у паўстанні 1830—1831 гг., эміграваў, але хутка вярнуўся. Стаў вядомым віленскім адвакатам.

* Францішак Малеўскі (1800—1870) — сябра таварыства філаматаў, сын рэктара Віленскага універсітэта, у 1824 г. сасланы разам з сябрамі ў цэнтральныя губерні Расіі. Жыў і працаваў у Пецярбургу.

* Міхал Рукевіч (1796—1841) — сябра таварыства філарэтаў, арганізатар таварыства ваенных сяброў (1825). Сасланы на катаргу ў Сібір.

* Вінцэнты Пялчынскі (пам. 1855) — эканаміст і публіцыст. У верасні 1819 г. выехаў у Пецярбург і нейкі час падтрымліваў дачыненні з сябрамі–філарэтамі, паведамляў ім пра культурнае жыццё сталіцы. Супрацоўнічаў з З. Даленга–Хадакоўскім, Т. Булгарыным.

* Вук Стэфанавіч Караджыч (1787—1864) — дзеяч сербскага нацыянальнага адраджэння, рэфарматар сербскага правапісу.

* “Pamiętnik Naukowy” — варшаўскі часопіс, што выдаваўся як працяг “Ćwiczeń naukowych” (1818) пад рэдакцыяй Скамароўскага ў 1819—1822 гг.

* Казімір Брадзінскі (1791—1835) — паэт–сентыменталіст, літаратурны крытык, творца прадрамантызму ў Польшчы.

* Магнетызм (або месмерызм) — папулярная напачатку XIX ст тэорыя Франца Месмера, у аснове якой сцвярджэнне, што жывыя арганізмы эмітуюць флюіды, якія адказваюць за нараджэнне пачуццяў і сімпатый.

* Ігнат Эмануэль Ляхніцкі (1793—1826), публіцыст і выдавец, даследчык гіпнозу, парапсіхолаг. Заснавальнік квартальніка “Pamiętnik Magnetyczny Wileński”, у якім шмат месца займала тэорыя і практыка біяэнергетыкі.

* Тамаш Зан (1796—1855) — паэт, адзін з арганізатараў віленскіх моладзевых арганізацый філаматаў, філарэтаў, прамяністых.

* Крыстаф Вільгельм Гуфеланд (1762—1836) — знакаміты лекар, літаратар, публіцыст. Аўтар прац: “Месмер і магнетызм” (1785), “Мастацтва падаўжэння чалавечага жыцця” (1805), “Сістэма практычнай медыцыны” (1800—1805).

* Ануфры Петрашкевіч (1793—1863) — адзін з заснавальнікаў таварыства філаматаў. Захавальнік архіву таварыства. У 1832 г. сасланы ў Сібір. На радзіму вярнуўся праз 35 гадоў.

## II. Тамаш Зан

* Марыля Верашчака (1799—1863) — каханая Адама Міцкевіча. Да замужжа з графам В. Путкамерам жыла ў Туганавічах ля Свіцязі.

* Францішак Багамолец (1720—1784) — паэт, драматург, рэдактар–выдавец, адзін з творцаў польскага Асветніцтва. Паходзіў з Віцебшчыны.

* Марыя Дунаюўна (1900—1979) — гісторык літаратуры. Паходзіла з Вільні, дзе закончыла універсітэт і працавала на кафедры ў Ст. ПігаНя. Пасля вайны — супрацоўніца універсітэцкай бібліятэкі ў Торуні. Аўтар кніг пра Т. Зана і філаматаў.

* Уладзіслаў Дыбоўскі (1838—1910) — біёлаг, этнограф і фальклярыст. Паходзіў з Адамарына ля Маладзечна.

* Мікалай Нікіфароўскі (1845—1910) — этнограф–фальклярыст. На працягу 20 гадоў быў карэспандэнтам П. Шэйна, а з 1890–х гг. выступаў з самастойнымі працамі.

* Шыман Шымановіч (1588—1629) — паэт эпохі Адраджэння, творца жанру ідылій. Адна з іх — “Kołacze” — пачыналася так: “Sroczka krzekce na płocie, będą goście nowi. // Sroczka czasem omyli, czasem prawdę powi”.

* Каспар Бекеш (1520—1579) — ваенны і палітычны дзеяч ВКЛ. Памёр у Гародні, як арыянін пахаваны ў Вільні на Лысай гары, якую пазней назвалі Бекешавай.

* Стафан Баторы (1533—1586) — абраны каралём Рэчы Паспалітай пасля таго, як узяў шлюб з дачкою Жыгімонта Старога.

* Юзаф Ігнацы Крашэўскі (1812—1887) — пісьменнік, публіцыст, аўтар шматлікіх раманаў, аповесцяў, паэм і нарысаў.

* Уладзіслаў Загорскі (пам. 1927) — сябра Польскага краязнаўчага таварыства, аўтар шматлікіх публікацый пра Вільню, у тым ліку “Podania i legendy wileńskie” (1925).

* Геранім Марцінкевіч (1816 — пасля 1864) — паэт, празаік, драматург. Аўтар трох томікаў паэзіі, беларускамоўнай вершаванай п’есы “Адвячорак. Аказія ў карчме пры Фальковічах” (1858).

* “Rubon” — альманах, які выдаваўся ў Вільні ў 1842—1849 гг. Рэдактар–выдавец — Казімір Буйніцкі. Друкаваліся творы Я. Баршчэўскага, Я. Чачота, Т. Лады–Заблоцкага, Г. Марцінкевіча, братоў Грымалоўскіх, І. Храпавіцкага і інш.

* Міхал Федароўскі (1853—1923) — фальклярыст, этнограф, археолаг. Аўтар фундаментальнай працы “Люд беларускі” (т. 1—8, 1897—1981).

* Ян Карловіч (1836—1903) — этнограф, фальклярыст, мовазнаўца. Падтрымліваў кантакты з В. Дуніным–Марцінкевічам, Ф. Багушэвічам, Э. Ажэшкаю.

* Еўдакім Раманаў (1855—1922) — этнограф і публіцыст. Прыхільнік “западнорусcизма”.

* Павел Дземідовіч (1871—1931) — этнограф і фальклярыст. У нарысе “З галіны вераванняў і паданняў беларусаў” (1896) апісаў народныя вераванні пра нячыстую сілу з Наваградскага і Мінскага паветаў.

* Мар’ян Гавалевіч (1852—1910) — пісьменнік, публіцыст, рэдактар і супрацоўнік шэрагу вядомых выданняў (“Kurier Warszawski”, “Tygodnik Powszechny”, “Kłosy”, “Tygodnik Ilustrowany”).

* Юзаф Уейскі (1883—1937) — гісторык літаратуры, прафесар Варшаўскага універсітэта.

* Вацлаў Ластоўскі (1883—1938) — публіцыст, літаратар, адзін з арганізатараў беларускага нацыянальнага руху ў пачатку XX ст.

* Аляксандр Валіцкі (1826—1893) — выдавец, музычны крытык, мінскі кнігапрадавец. Пасля высылкі (1863—1867) жыў у Варшаве. З 1872 г. працаваў карэктарам, у выніку чаго ўзнікла праца “Błędy nasze w mowie i piśmie” (1879), якую некалькі разоў перавыдавалі.

* Тадэвуш Мікульскі (1909—1958) — гісторык літаратуры, прафесар Уроцлаўскага універсітэту.

* Іван Насовіч (1788—1877) — мовазнавец, фальклярыст, этнограф. Больш за 16 гадоў ён працаваў над тлумачальна–перакладным “Словарем белорусского наречия” (завершаны ў 1863 г., выдадзены ў 1870 г.).

* Павел Шэйн (1826—1900) — этнограф і лінгвіст, збіральнік і выдавец беларускага фальклору.

* Аляксандр Сержпутоўскі (1864—1940) — этнограф, фальклярыст і мовазнавец. Удзельнік шматлікіх этнаграфічных і лінгвістычных экспедыцый.

* Эдвард Кліх (1878—1939) — мовазнаўца, прафесар Пазнанскага універсітэту. Аўтар кнігі “Teksty białoruskie z powiatu Nowogródzkiego. Materjały i prace Komisji językowej. Kraków, 1903, t. II, zesz. 1.

* Міхаіл Дзмітрыеў (1832—1873) — этнограф–фальклрарыст, настаўнік рускае мовы наваградскага дваранскага вучылішча, аўтар–складальнік кнігі “Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо–Западного края” (Вильна, 1869).

* Юзаф Каленбах (1861—1929) — гісторык літаратуры, даследчык творчасці паэтаў–рамантыкаў. Прафесар Львоўскага, Варшаўскага, Віленскага і Ягелонскага універсітэтаў.

* Яўхім Карскі (1860—1931) — філолаг–славіст, даследчык беларускае мовы і літаратуры. Рэктар Варшаўскага універсітэта (1905—1910). У сваіх працах выяўляў погляды, блізкія да ідэалогіі “западноруссизма”.

## III. Ян Чачот

* Паводле новых звестак Ян Чачот нарадзіўся ў Малюшыцах (цяпер — Карэліцкі раён) 24 чэрвеня 1796 г. Але ў хуткім часе сям’я пераехала ў маёнтак Рэпіхава.

* Ігнацы Дамейка (1802—1889) — сябра таварыства філарэтаў, вучоны–геолаг, мінеролаг. Аўтар успамінаў пра філаматаў–філарэтаў.

* Паводле новых звестак Я. Чачот не быў студэнтам Віленскага універсітэта, але рыхтаваўся экстэрнам здаць экзамены, каб працаваць праўнікам.

* Маса Радзівілаўская — канцылярыя Камісіі па ўпарадкаванні спадчыны Дамініка Радзівіла.

* Юзаф Яжоўскі (каля 1793 — 1855) — прэзідэнт таварыства філаматаў, паэт, філолаг. Паходзіў з Украіны. У 1824 г. высланы ў Расію, працаваў у Казанскім універсітэце. Выдаў з навуковым каментаром оды Гарацыя, “Адысею” Гамера.

* Дыяніз Хлявінскі — філамат, ксёндз. Паходзіў з Наваградчыны.

* Ярашавыя імяніны — урачыстасць, прысвечаная Францішку Малеўскаму, якога сябры называлі Ярашам.

* “God save the King” — патрыятычная песня, нацыянальны гімн Вялікабрытаніі.

* Атон Слізень (1806—1887) — студэнт фізіка–матэматычнага факультэта Віленскага універсітэта (1821—1823), сябра таварыства філарэтаў. Аўтар успамінаў пра вучобу ў Наваградку, Полацку і Вільні.

* Ян Чубак (1849—1932) — гісторык літаратуры, бібліятэказнаўца. Упарадкаваў і выдаў карэспандэнцыю (у пяці тамах) і паэзію (у двух тамах) філаматаў.

* “Tygodnik illustrowany” — газета літаратурна–мастацкага і грамадска–палітычнага характару. Выходзіла ў Варшаве ў 1859—1839 гг. Змяшчаліся краязнаўчыя, гісторыка–літаратурныя, фальклорна–этнаграфічныя матэрыялы.

* Вітольд Клінгер (1875—1962) — класічны філолаг, гісторык літаратуры, прафесар. Выявіў шэраг невядомых матэрыялаў пра філаматаў: “Sztambuch filomaty” (Юзафа Кавалеўскага // Przegląd Naukowy i Pedagogiczny. Kijów, R. 1, nr 3, s. 173—201; “Z niedrukowanych poezyj więziennych Jana Czeczota” // Tygodnik Ilustrowany, 1922, R. 63, nr 22, s. 342—343).

* Зося Малеўская — малодшая дачка рэктара Віленскага універсітэта Шымана Малеўскага. Прадмет “платанічных і неплатанічных” (А. Слізень) уздыханняў Я. Чачота, Т. Зана, А. Ходзькі.

* Юзаф Кавалеўскі (1801—1878) — сябра таварыства філарэтаў, у Віленскім універсітэце вывучаў класічную філалогію. У 1824 г. высланы ў Казанскі універсітэт, дзе вывучаў арыенталістыку. Пазней даследаваў мангольскую мову. З 1834 г. — пра-

фесар, пасля рэктар Казанскага універсітэта. У 1862—1878 гг. працаваў у Варшаўскім універсітэце.

* “Ognisko Domowe” — двухтыднёвая газета, прысвечаная літаратуры, мастацтву, навуцы; выдавалася ў Львове ў 1883—1888 гг.

* “Dziennik Polski” — штодзённая газета, якая выдавалася ў Львове ў 1867—1915 гг.

* “Biesiada Literacka” — ілюстраваны літаратурны штотыднёвік, які выходзіў у Варшаве ў 1876—1917 гг. Друкаваліся творы Ю.І. Крашэўскага, Г. Сянкевіча, Б. Пруса і інш.

* Леапольд Мэе (1849 ці 1850 — 1912) — праўнік, літаратар, даследчык літаратуры.

* “Kurjer Warszawski” — штодзённая газета, якая выходзіла ў Варшаве з 1821 па 1939 г.

* Адам Плуг (Антоні Пяткевіч, 1823—1903) — літаратар і журналіст. З 1887 г. жыў у Варшаве, рэдагаваў “Kłosy” і інш. выданні.

* Тадэвуш Піні (1872—1937) — выдавец, гісторык літаратуры і крытык. Сябра Літаратурнага таварыства імя Адама Міцкевіча. Рыхтаваў да выдання Поўны збор твораў А. Міцкевіча.

* Адам Кіркор (1818—1886) — літаратар, публіцыст, выдавец. Арганізатар культурнага і літаратурнага жыцця ў Вільні ў сярэдзіне XIX ст. Часта выкарыстоўваў псеўданім Ян з Слівіна.

* Станіслаў Дабжыцкі (1875—1931) — гісторык літаратуры, прафесар і рэктар Пазнанскага універсітэта. Даследаваў творчасць А. Міцкевіча, падрыхтаваў да выдання “Жыццё Адама Міцкевіча” (1929—1931) Уладзіслава Міцкевіча.

* Галіна Турска (1901—1979) — філолаг–мовазнаўца, супрацоўніца універсітэту Стафана Баторыя ў Вільні (1929—1939), прафесар універсітэту Мікалая Каперніка ў Торуні (1946—1962). Даследавала мову літаратараў, што паходзілі з Віленшчыны.

## IV. Ануфры Петрашкевіч і Тэадор Лазінскі

* Антоні Фрэенд — адзін з вязняў па справе філаматаў–філарэтаў, эпізадычны герой “Дзядоў” А. Міцкевіча.

## V. “Балады і рамансы” Адама Міцкевіча

* Юліюш Кляйнер (1886—1957) — гісторык літаратуры, прафесар Варшаўскага універсітэта (1916—1920), Люблінскага каталіцкага універсітэта (1944—1947), Ягелонскага універсітэта (1947—1957). Даследаваў літаратуру эпохі рамантызму.

* Станіслаў Пігань (1885—1968) — гісторык літаратуры. Прафесар універсітэта Стафана Баторыя ў Вільні (1921—1930), пазней — прафесар Ягелонскага універсітэта (1931—1939, 1945—1960). Даследаваў літаратуру эпохі Рамантызму, творчасць А. Міцкевіча.

* Конрад Гурскі (1895—1990) — гісторык і тэарэтык літаратуры, Прафесар універсітэта імя Стафана Баторыя ў Вільні (1934—1939) і ўніверсітэта імя Мікалая Каперніка ў Торуні.

* Ігнацы Красіцкі (1735—1801) — біскуп вармінскі, паэт, празаік і публіцыст. Прадстаўнік польскага Асветніцтва. Аўтар “Мышаіды”, “Манахамахіі” і інш.

* Стэфанія Скварчынская (1902—1988) — тэарэтык і гісторык літаратуры, прафесар Лодзьскага універсітэта. Даследавала літаратуру эпохі Рамантызму, творчасць А. Міцкевіча.

* Генрык Шыпер (1900—1949) — гісторык літаратуры, педагог. Абараніў дысертацыю "Сентыменталізм у творчасці Міцкевіча" (1924), падрыхтаваў выдатнае выданне "Дзядоў" (1928—1929).

* Юльян Кшыжаноўскі (1892—1976) — гісторык літаратуры, фальклрыст. Працаваў у Варшаўскім універсітэце.

* Антоні Глінскі (1817—1866) — фальклярыст і літаратар. Аўтар папулярнага зборніка "Bajarz polski: Baśni, powieści i gawędy ludowe" (1862).

* Станіслаў Здзярскі (1878—1928) — гісторык літаратуры, этнограф, журналіст. Даследчык фальклорных вытокаў рамантычных твораў.

* Оскар Кольберг (1814—1890) — этнограф–фальклярыст і кампазітар. Галоўнае даследаванне — 33 тамы працы "Lud. Jego zwyczaje, sposób życia, mowa, podania, przysłowia, obrzędy, gusła, zabawy, pieśni, muzyka i tańce" (1857—1890).

* Севярын Гашчынскі (1801—1876) — паэт, грамадскі дзеяч. Самы вядомы твор — паэма "Канеўскі замак" (1828) — апавядае пра паўстанне гайдамакаў на Украіне.

* Эдвард Паўловіч (1825—1909) — мастак, педагог. Удзельнік паўстання 1863—1864 гг. Да 1870 г. жыў пераважна на Наваградчыне, што адлюстравана ў шэрагу яго публікацый мемуарнага характару.

* Адам Бэлцікоўскі (1839—1909) — гісторык літаратуры, паэт, драматург. Працаваў на кафедры польскай літаратуры Галоўнай школы ў Варшаве, пасля — Ягелонскага універсітэта. Даследаваў творчасць А. Міцкевіча.

* Альбрыхт Радзівіл (1593—1656) — дзяржаўны дзеяч, гісторык, аўтар мемуараў. Паслядоўны абаронца незалежнасці Вялікага Княства Літоўскага.

* Казімір Уладзіслаў Вуйціцкі (1807—1879) — фальклярыст і літаратар. У яго Варшаўскім салоне сустракаліся прадстаўнікі літаратуры, навукі і культуры.

* Мадэевае ложа — ложак, падрыхтаваны ў пекле для разбойніка Мадэя; нязручны ложак.

* Генрык Бегаляйсан (1855—1934) — гісторык літаратуры і этнограф. Даследаваў літаратуру эпохі Рамантызму ("Motywy ludowe w balladzie Mickiewicza Lilie", 1891)

* Францішак Карпінскі (1741—1825) — паэт–сентыменталіст. Апошнія трыццаць гадоў жыцця правёў на Беларусі — на Гродзеншчыне і Пружаншчыне.

* Вільгельм Брухнальскі (1859—1938) — гісторык літаратуры, прафесар Львоўскага універсітэта. Даследаваў творчасць А. Міцкевіча, разам з Раманам Пілатам пачаў выдаваць "Збор твораў" паэта. Падрыхтаваў каментар да "Пана Тадэвуша". Адзін з самых глыбокіх знаўцаў творчасці А. Міцкевіча ў міжваеннай Польшчы.

* Уладзіслаў Вярыга (1868—1916) — этнограф–фальклярыст, рэдактар часопіса "Przegląd filozoficzny". У кнізе "Беларускія паданні" (1889), змясціў 32 беларускія казкі з Лідскага павету

* Ганс Гайлінг Фельсан — легендарны персанаж германскай і чэшскай міфалогіі.

* Пётр Хмялёўскі (1848—1904) — гісторык літаратуры. Прафесар Львоўскага універсітэта.

* Аляксандр Ходзька (1804—1891) — паэт, сябра таварыства філарэтаў, вучоны–ўсходазнавец, педагог. У сваёй творчасці выкарыстоўваў беларускі фальклор.

* Пратапляст — родапачынальнік.

* Ігнацы Анацэвіч (1780—1845) — гісторык, археограф і архівіст. Прафесар Віленскага універсітэта.

* Ян Баршчэўскі (1790–я гг. — 1851) — паэт і пісьменнік. Шырока выкарыстоўваў у сваёй творчасці беларускі фальклор.

* Ёган Вольфганг Гётэ (1749—1832) — геніяльны нямецкі паэт.
* Кадучне — ліха.
* Аляксандр Рыпінскі (1809 — пасля 1886) — паэт, аўтар кнігі “Беларусь” (Парыж, 1840). Асновай яго творчасці з’яўляўся фальклор славянскіх народаў.
* Раўда — жалобная песня.
* Юльян Урсын Нямцэвіч (1758—1841) — літаратар, гісторык, публіцыст. Удзельнік паўстання 1794 г. (ад’ютант і сакратар Т. Касцюшкі) і паўстання 1830—1831 гг.
* Готфрыд Аўгуст Бюргер (1747—1794) — нямецкі літаратар, аўтар балад “Лянора” (1773), “Дзікі паляўнічы” (“Der wilde Jager”, 1786) і інш.
* Васіль Жукоўскі (1783—1852) — расійскі літаратар, перакладчык нямецкае паэзіі.
* Мар’ян Шыйкоўскі (1883—1952) — гісторык літаратуры, кампаратывіст, прафесар Ягелонскага і Пражскага універсітэтаў.

## VI. “Дзяды”

* Юзаф Галомбак (1889—1939) — гісторык літаратуры, славіст. Дацэнт Варшаўскага універсітэта. Аўтар працы “Wincenty Dunin–Marcinkiewicz. Poeta polsko–białoruski” (Wilno 1932). Загінуў на пачатку Другой сусветнай вайны.
* “Kurjer Wileński” — палітычная і літаратурная газета, афіцыйны орган Паўночна–Заходняга краю. Выдавалася з 1841 да 1915 г. у Вільні. З 1865 г. толькі па–расійску (“Виленский вестник”).
* Інкантацыі — заклінанні.
* Неаплатонікі — плынь антычнае філасофіі (III–IV стст.), у якой аб’ядноўваліся элементы філасофіі Платона, Арыстоцеля і ўсходняй філасофіі.
* Аляксандр Поуп (1688—1744) — англійскі паэт, тэарэтык класіцызму.
* Джордж Гордан Байран (1788—1824) — геніяльны англійскі паэт.
* Казімір Машынскі (1887—1959) — вучоны–славіст, заснавальнік першае ў свеце кафедры этнаграфіі славян (Кракаў, 1925)
* Вацлаў Баровы (1890—1950) — гісторык літаратуры, літаратурны крытык, прафесар Варшаўскага універсітэта.
* Рамуальд Зянкевіч (1811—1868) — фалькларыст, педагог, адзін з першых беларускіх этнографаў.
* Чэслаў Латавец (1902—1986) — гісторык літаратуры, педагог. У 1930 г. у Пазнанскім універсітэце абараніў дысертацыю “Дзяды” Адама Міцкевіча: новае асвятленне праблемаў”.
* Марыя Канапніцкая (1842—1910) — літаратар, літаратурны крытык і публіцыст.
* Вацлаў з Алеска (Вацлаў Залескі, 1799—1849) — фалькларыст, паэт, літаратурны крытык. У 1833 г. у Львове выдаў “Pieśni polskie i ruskie ludu galicyjskiego”.

## VII. Іншыя творы Міцкевіча

* Казімір Ніч (1874—1958) — славіст мовазнаўца, гісторык польскае мовы, дыялектолаг. Прафесар Ягелонскага і Львоўскага універсітэтаў.
* Люцыян Маліноўскі (1834—1898) — славіст–мовазнаўца, прафесар.
* Станіслаў Віндакевіч (1863—1943) — гісторык літаратуры, прафесар Ягелонскага універсітэта.

## IX. Антон Эдвард Адынец

* Вінцэнт Кішка–Згерскі з Цяханава (канец XVIII — 1840) — віленскі паэт–графаман, што выдаваў уласным коштам свае творы.
* Юліюш Славацкі (1809—1849) — вядомы польскі паэт–рамантык.
* Альгерд Абуховіч (1840—1898) — літаратар і мемуарыст, дзеяч беларускага нацыянальнага адраджэння XIX ст.

## X. Аляксандр Ходзька

* Элаіза Ажэшка (1841—1910) — пісьменніца, аўтарка аповесцяў і раманаў, у якіх адлюстроўвала беларускія рэаліі XIX ст.

## XI. Менш значныя паэты

* Ігнат Кулакоўскі (1800—1860) — вучыўся ў Варшаўскім універсітэце. Друкаваў свае вершы ў “Dzienniku Wileńskim”, а пасля выдаў іх у зборніку “Zabawki wierszem” (Вільня, 1824).
* Аляксандр Грот–Спасоўскі (1807—1847) — паэт–рамантык, аўтар двухтомніка “Вершаваныя творы” (1840).